

ДУА "Капцянская базавая школа імя Г.С. Грыгор'ева"

*Лістапад*

# Школьны

## Сёння ў нумары:

- Урачыстая лінейка, прысвечаная пачатку 2 чвэрці;
- Прафілактыка злачынстваў ва ўстановах адукацыі;
- Акцыя «Мемарыял»;
- Суботні дзень здароўя;
- Раённыя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы;
- Медыцынскі сімпозіум «Сигарет. NET»;
- 140-годдзе з дня нараджэння Я.Коласа

Урачыстая лінейка, прысвечаная пачатку 2 чвэрці



Дырэктар "Капцянскай базавай школы імя Г.С. Грыгор'ева" Заруба К.У. І павіншавала прысутных з пачаткам новай чвэрці. На лінейцы былі ўручаны граматы вучням, якія закончылі першую чвэрць на "7" і "9". Таксама атрымалі ўзнагароды пераможцы першага этапа Рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, за ўдзел у конкурсах, спартыўных спаборніцтвах. Былі ўручаны членскія білеты БРСМ вучням 9 класа.



## Прафілактыка злачынстваў ва ўстановах адукацыі




З 14 па 16 лістапада ў адпаведнасці з нарматыўна - прававымі актамі МУС на тэрыторыі Віцебскай вобласці праводзіцца спецыяльная праграма "Допінг".

Асноўная задача - перакрыццё каналаў паступлення ў незаконны абарот лекавых сродкаў, якія змяшчаюць у сваім складзе наркатычныя сродкі і псіхатропныя рэчывы.

Старшы ўчастковы інспектар ІСН АУС Віцебскага раёна маёр міліцыі Дзямешчанка А. М. выступіў па спецпраграме "Допінг", у рамках месячніка па палавой недатыкальнасці з мэтай прафілактыкі парнаграфіі і палавой свабоды, агітацыі паступлення ў навучальныя ўстановы, прафілактыцы злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій.



# Акцыя «Мемарыял»



У рамках арганізацыі работы па грамадзянска-патрыятычным выхаванні, у мэтах працоўнага выхавання актыў школы і члены "Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі" прынялі ўдзел ва ўборцы Мемарыяльнага комплексу імя Ленінскага камсамола ў аграгарадку Копці.

Вучні ачысцілі тэрыторыю ад апалага лісця і галінак, сабралі смецце, вычысцілі пліту помніка. Дзякуючы дружнай і зладжанай рабоце наведзены парадак. Добраўпарадкаванне помнікаў, воінскіх пахаванняў - гэта даніна мужнасці і стойкасці пакаленням, якія прайшлі вайну. Гэта клопат аб будучыні нашага аграгарадка. Маладое пакаленне павінна ведаць гісторыю і шанаваць памяць продкаў, памятаць, якім коштам дасягнута Перамога.



# Суботні дзень здароўя



Дзень здароўя ў школе - вельмі важнае і патрэбнае мерапрыемства. Дзеці - наша будучыня. Каб яны былі здаровымі, трэба з малых гадоў прывіваць дзецям навыкі здаровага ладу жыцця, выхоўваць у іх беражлівыя адносіны да свайго ўласнага здароўя, прывучаць іх да спорту.
У нашай школе стала добрай традыцыяй праводзіць Дзень здароўя. Спартыўна-масавыя мерапрыемствы садзейнічаюць



выхаванню цікавасці да здаровага ладу жыцця.
Весела і цікава праходзіў чарговы такі дзень, арганізатарам якога быў настаўнік фізічнай культуры і здароўя Уладзімір Ігаравіч Дудкін. Спаборніцтвы на сілу, спрыт для навучэнцаў 5-9 класаў праходзілі пад дэвізам "Спорту - быць!". А кульмінацыяй дня стала гульня ў валейбол, у якой прынялі ўдзел старшакласнікі нашай школы.
Дзень здароўя прайшоў сапраўды выдатна, падарыўшы ўсім зарад

## Раённыя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы

Вучні Капцянскай школы прынялі ўдзел у раённых спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы. Сярод іх – Каржанава Маргарыта, вучаніца 7 класа.




– Маргарыта, табе хочацца атрымаць перамогу?

– Так, прыемна было б, каб наша каманда выйшла пераможцам.

– А ты любіш спорт?

– Люблю, з 5 класа наведваю  валейбольную і баскетбольную секцыі ў школе. Неаднаразова займала 1 і 2 месцы па валейболе і лёгкай атлетыцы ў раённых спаборніцтвах.

–Ці хочаш у будучым звязаць сваё жыццё са спортам?




–Мару стаць настаўнікам фізічнай культуры.

–Поспехаў табе!

# Медыцынскі сімпозіум «Сигарет.**NET**»




Дзённікавыя запісы (падзеі ў храналогіі):

2018 год—”Захворванні, выкліканыя курэннем”,

“Віды тытуню”.

2019—”Звычкі, якія забіваюць”, “Шкода курэння”.

2020—”Усё аб цыгарэтах”, “Тытунь—самы галоўны забойца”.

2021—”Замяняльнікі цыгарэт: “за”і “супраць”, “Вынікі нікацінавай залежнасці”.

2022— “Ці шкодны вэйп?”, “Сигарет.NET”, “Курэнне — медыка-сацыяльная праблема”.



140-годдзе з дня нараджэння Я.Коласа

## Віктарына



1. Назавіце сапраўднае імя Я.Коласа.
2. Які верш паслужыў пачаткам літаратурнай дзейнасці?
3. Назавіце малую радзіму Я.Коласа.
4. Кім па прафесіі быў паэт?
5. У якім творы паэт апісаў родныя мясціны?
6. З якой ракой цесна звязана жыццё Я.Коласа?
7. У якіх творах сустракаецца назва гэтай ракі?
8. Якую назву носіць першая кніга Я.Коласа, прызначаная для дзяцей?
9. З якога твора гэтыя радкі: “Мой родны кут, як ты мне мілы…”?
10. Які вядомы твор Я.Коласа называюць “энцыклапедыяй сялянскага жыцця”?
11. Якія творы Я.Коласа былі экранізаваны?
12. Назваць вершы паэта, на тэксты якіх былі напісаны песні.
13. У якім горадзе знаходзіцца літаратурны музей Я.Коласа?